аів

у дапамогу педагогу



# Псіхалогія

***Выпуск 9***

1997
IV квартал

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Штоквартальны
навукова-метадычны часопіс
Выдаецца з IV квартала 1995 года
Рэгістрацыйны № 432

*Выпуск 9'97*

IV квартал

# Псіхалогія

**Заснавальнік і выдавец** —
рэдакцыя часопіса
"Адукацыя і выхаванне"

*Галоўны рэдактар*
**У.П.Пархоменка**

**Рэдакцыйная калегія**

*Галоўны рэдактар*
Я.Л.Каламінскі
*Нам. галоўнага рэдактара*
А.М.Сізанаў
*Адказны сакратар*
Н.Ю.Зайцава

В. Ц. Кандрашэнка
Л. А. Панько
Л. А. Пергаменшчык
Г. Г. Рамановіч
Л. М. Рожына
Н. Я. Турышава
І. А. Фурманаў

220004, г. Мінск,
вул. Караля, 16;
тэл.: 220-54-81, 220-54-10

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Змест

## Новыя даследаванні


*Ф.И.Иващенко.* Особенности целеполагания в деятельности воспитателя ..........

*В.Л.Марищук, Л.В.Марищук.* Восприятие действительности при сильных эмоциях и закрепившихся психологических установках .......... 11

*С.А.Игумнов.* Психотерапевтические аспекты проблемно-решающего поведения .......... 18

*С.В.Талайко.* Факторная структура "Образа Я" учителя в зависимости от длительности педагогической деятельности .......... 24


## 100-годдзе Л.С.Выгоцкага


*Н.В.Кузьмина.* Акмеологические проблемы учителя в свете идей Л.С.Выготского .......... 37


## Псіхолаг — псіхолагу


*Л.А.Кандыбович, А.Н.Сизанов.* Материально-техническое и методическое обеспечение работы кабинета психолога .......... 43

*В.В.Евсеенко.* Влияние семейной микросреды на психологическое здоровье подростка .......... 52

*Л.В.Пилясова.* Место психолога в учебно-воспитательном процессе .......... 58


## Энцыклапедыя практычнага псіхолага


Опросник потребности в психологической помощи .......... 63


## Псіхалогія і здароўе


*С.В.Отчик.* Психология здоровья — перспективная отрасль психологии .......... 69


## Крок у навуку


*Д.Е.Гезахегн.* Проблема лидерства в современной социальной психологии .......... 88


## Гісторыя псіхалогіі


*Я.Л.Коломинский.* Двадцать лет спустя .......... 103


## Кароткія паведамленні


*А.А.Амялькоў.* Псіхалагічныя асновы маральнага развіцця асобы юнацкага ўзросту ва ўмовах вышэйшай навучальнай установы .......... 116

*Л.А.Пергаменщик.* Четвертая международная конференция по кризисной психологии .......... 118


## Пакой псіхалагічнай разгрузкі


*А.Н.Сизанов.* Покажи мне, какие у тебя ногти... .......... 124



© "Адукацыя і выхаванне", 1997
© Вокладка Г.В.Зайцаў, 1997

РЭПОЗІТОРЫЙ БДПУ

# ПСІХАЛАГІЧНЫЯ АСНОВЫ МАРАЛЬНАГА РАЗВІЦЦЯ АСОБЫ ЮНАЦКАГА ЎЗРОСТУ ВА ЎМОВАХ ВЫШЭЙШАЙ НАВУЧАЛЬНАЙ УСТАНОВЫ

***А.А.Амялькоў***

Псіхалагічныя даследаванні паказваюць, што па ўзроўні маральнага развіцця асобы ў студэнтаў-першакурснікаў адзначаецца значная дыферэнцыяцыя. Па нашых даных, у большасці юнакоў і дзяўчат (65 %), якія паступілі на першы курс пасля школы, на жаль, праяўляюцца ўсе прыкметы канвенцыяльнага ўзроўню маральнага развіцця. У вольных выказваннях і меркаваннях у спецыяльна арганізаваных сітуацыях нядаўнія выпускнікі сярэдніх школ прытрымліваюцца групавых маральных нормаў, арыентуюцца на выказванні асоб з рэферэнтных груповак або на маральныя нормы, вызначаныя асобнымі выкладчыкамі ці адміністрацыяй факультэта. У паводзінах такіх студэнтаў бачна імкненне рабіць тое, чаго ад іх чакаюць, і тое, што падмацоўваецца пахвалой.

У другой часткі студэнтаў (27 %) адзначаецца адносная незалежнасць маральных каштоўнасцей асобы ад роляў і аўтарытэтаў. Гэтыя студэнты часцей за іншых звяртаюцца да дарослых (выкладчыкаў, бацькоў, студэнтаў старэйшых курсаў) з пытаннямі, якія патрабуюць меркаванняў, разважанняў. Яны пазбягаюць уступаць у дыскусіі з асобамі, якія не разважаюць, а павучаюць у катэгарычнай форме. У зносінах з адзначанай групай студэнтаў адчуваецца іх патрэба знайсці ў разважаннях з больш вопытнымі людзьмі універсальныя каштоўнасныя арыентацыі, незалежныя маральныя стэрэатыпы, самастойныя меркаванні. Калі адзначаныя з'явы ў студэнта праяўляюцца, іх можна ўмоўна лічыць асобаснымі новаўтварэннямі ранняга юнацкага ўзросту.

У групах першакурснікаў ёсць і студэнты, у якіх адзначаюцца ўласныя маральныя прынцыпы. У спецыяльна арганізаваных

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

сітуацыях такія студэнты, як правіла, пазбягаюць адкрытых дыскусій з выкладчыкамі, але маюць пэўныя ўстойлівыя погляды на грамадскія і іншыя з'явы. Яны часцей прымаюць на сябе маральную адказнасць за групавыя ўчынкі з улікам каштоўнасцей, прынятых у грамадстве. У гэтую групу ў асноўным уваходзяць студэнты, якія ўжо маюць працоўны стаж больш за год, і такіх людзей на першым курсе каля 6 %.

Для таго каб вызначыць асаблівасці маральнага развіцця студэнтаў ва ўмовах вышэйшай навучальнай установы, намі зроблены тры зрэзы сацыяльна-псіхалагічнага даследавання ў адных і тых жа студэнтаў на першым, другім і трэцім курсах факультэта прыкладной псіхалогіі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта. Даследаванне ўключала псіхалагічны аналіз спецыяльна арганізаваных дыскусій у студэнцкіх групах па актуальных пытаннях жыцця грамадства, праектыўныя методыкі (метад асацыяцый і метад незавершаных сказаў), экспрэс-метады вывучэння міжасобасных зносін і адносін у студэнцкіх групах. Дадаткова выкарыстоўваліся метад гутаркі і стандартызаваныя назіранні. Колькасны і якасны аналіз атрыманых вынікаў дазваляе акрэсліць наступныя асаблівасці:

◊ большасць студэнтаў (75 %) за два гады навучання і міжасобаснага ўзаемадзеяння ва ўмовах вышэйшай навучальнай установы набываюць адметныя дынамічныя змяненні (даставерна на ўзроўні P = 0,05) у колькасных паказчыках маральнага развіцця;

◊ найбольшых станоўчых змяненняў у маральным развіцці дасягаюць студэнты, якім прадастаўляецца больш плюралізму ў разважаннях пры абмеркаванні маральных праблем;

◊ значных змяненняў у колькасных паказчыках маральнага развіцця не выяўлена ў студэнтаў, якія ў гэты сензітыўны для фарміравання самасвядомасці асобы перыяд не мелі магчымасці свабодна ўзаемадзейнічаць з іншымі людзьмі і на якіх моцна ўздзейнічалі ў сям'і ці ў спецыяльна створанай грамадскай супольнасці.

Адзначаныя асаблівасці сведчаць аб тым, што маральнае развіццё студэнцкай моладзі ў большай ступені залежыць ад узроўню развіцця ўзаемадзеяння ў малых групах. Гэта дае падставу сцвярджаць, што маральнаму развіццю асобы юнацкага ўзросту ва ўмовах вышэйшай навучальнай установы можна спрыяць удасканаленнем форм і зместу міжасобасных зносін у сумеснай дзейнасці, а таксама ў вучэбных групах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ